**Алексніна І.А.,**
*аспірантка кафедры*
*тэатральнай творчасці*

# АМАТАРСКАЯ ТЭАТРАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 20—30-я гг. XX СТАГОДДЗЯ (на прыкладзе Прыдзісненскага рэгіёна)

На стан культуры вялікі ўплыў аказвае шэраг featured рознабаковых прычын: палітыка, эканоміка, рэлігія, агульны ўзровень жыцця. Менавіта таму заходнебеларуская культура мае свае, асаблівыя рысы станаўлення і напрамкі развіцця ў адрозненне ад культуры цэнтральнай Беларусі. Галоўнай асаблівасцю можна назваць прыналежнасць тэрыторыі Прыдзісненскага рэгіёна да буржуазнай Польшчы, што выклікала неабходнасць існавання ўсёй культуры, у тым ліку і тэатральнай, у абставінах цеснага памежжа беларускай і польскай культур.

Цэнтрам эканомікі, палітыкі і духоўнага жыцця заходніх беларусаў заўсёды была Вільня. У час панавання Польшчы галоўная ўвага надаецца станаўленню і развіццю менавіта польскай культуры. Як у Вільні, так і ў Заходняй Беларусі пачынае сваю дзейнасць вялікая сетка грамадска-культурных арганізацый, якія прапагандуюць польскую культуру. Носьбітамі мовы і культурных традыцый становяцца настаўнікі, шляхта. Галоўны накірунак іх працы — актыўны ўдзел насельніцтва ў польскіх арганізацыях. Адначасова ўзрастае імкненне беларускай інтэлігенцыі да вывучэння і адраджэння духоўнай спадчыны сваіх продкаў. З гэтай мэтай у Вільні пачынаюць выдавацца беларускія часопісы і газеты, у вёсках ствараюцца гурткі, дзе ладзяцца чытанні беларускіх выданняў, праводзяцца лекцыі, вечарыны з невялікімі драматычнымі пастаноўкамі, народнымі песнямі, танцамі, гульнямі. Пашыраецца сетка беларускіх школ. Носьбітамі нацыянальнай культуры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

становяцца маладыя настаўнікі, местачковыя інтэлігенты і ўдзельнікі беларускіх арганізацый. Часам дзейнасць дзвюх супрацьлеглых культур узаемадапаўняе і ўзбагачае адна адну. Часцей, на жаль, адбываецца адваротнае: моцная ўціскае слабейшую. Зразумела, што "слабейшай" у той перыяд часу была беларуская культура; але не з прычыны сваёй мастацкай недасканаласці, а таму, што польскія ўлады ўсялякімі сродкамі імкнуліся "захаваць спакой публічны", "здушыць парасткі сцэнічнай творчасці беларусаў". Тым не менш рост нацыянальнай самасвядомасці і грамадскай актыўнасці працоўных мас "выклікалі да жыцця больш і больш аматарскіх калектываў..."— адзначае даследчык заходнебеларускай тэатральнай культуры А.Лабовіч.

Развіццё тэатральнай справы на тэрыторыі Прыдзісненскага рэгіёна ва ўказаны перыяд цесна звязана з дзейнасцю грамадска-культурных арганізацый, якія працавалі ў Вільні. У 1926 годзе там створаны Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (далей БІГіК), які на працягу 10 год плённа працаваў у культурна-асветніцкай галіне. Пад яго эгідай адчыняецца і дзейнічае вялікая колькасць гурткоў у вёсках і мястэчках, працуюць драматычныя секцыі, арганізуюцца выезды тэатральных труп. Пры галоўнай управе БІГіК быў створаны так званы "аб'язны тэатр". Яшчэ адной дастаткова значнай установай было Таварыства беларускай школы (ТБШ), створанае на год пазней за Інстытут. Пад яго кіраўніцтвам працавалі 134 бібліятэкі-чытальні, 41 народны дом, 4 беларускія гімназіі, драмгурткі па вясковых школах. Менавіта на дзейнасці гэтых арганізацый на глебе аматарскай тэатральнай культуры мы і засяродзім нашу ўвагу.

БІГіК быў "мозгам, сэрцам і душою" маладзёжных аб'яднанняў на перыферыі. З 1927 года ім кіраваў ксёндз В.Гадлеўскі. Адна з мэт дзейнасці інстытута — "пашырэнне і падтрымліванне духоўнай культуры, навукі і асветы". БІГіК даваў дазвол на стварэнне гуртка, які

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

дзейнічаў пазней пад яго эгідай. Для гэтага неабходна было сабраць не менш трох чалавек — аднадумцаў, прызначыць старшыню, скарбніка, сакратара і даслаць заяву ў Вільню. У заяве ўказвалі кіраўніка і адрас гуртка. Асноўнай мэтай дзейнасці такіх гурткоў былі падтрымка і развіццё роднай мовы, рост самасвядомасці беларускай моладзі, адраджэнне духоўнасці. Дазвол на ўсе культурныя мерапрыемствы ў абавязковым парадку атрымлівалі ад урада аддзела БІГіК. Для атрымання дазволу на спектакль у Вільню дасылалі заяву наступнага зместу:

"Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры
Гурток.....староства.......павет........

Асноўваючыся на параграфе 4 (1 і 58) Статута Таварыства Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, маем гонар прасіць аб выданні гуртку Інстытута ў в. ..... воласці ..... дазволу на арганізацыю тэатральнага прадстаўлення ў в. ..... у доме (будынку) ..... дня ..... месяца ..... года .....

Адыграна будзе камедыя (драма, п'еса) аўтара ....., якой 2 экземпляры пры гэтым далучаем.

Пасля спектакля будуць скокі, гульні.
Пачатак спектакля а ..... гадзіне.
Адказнасць за вечар бярэ на сябе Старшыня ўрада гуртка гр......
Подпіс".

За заяву трэба было заплаціць 2 злотых 80 грошай.

Акрамя гэтага, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры праводзіў цэнзуру твораў беларускіх драматургаў. Напрыклад, у 1927 годзе гурткам інстытута рэкамендаваны да пастановак наступныя творы: "Боты", "Чорт і баба", "Заручыны Паўлінкі", "Страхі жыцця", "Пан міністр", "Птушка шчасця", "Шчаслівы муж" Ф.Аляхновіча; "Не розумам сцяміў, а сэрцам" К.Вясёлага;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Мікітаў лапаць” М.Чарота; “Паўлінка” Я.Купалы; “Выбары старшыні”, “Суд над трохпалоўкай”, “Пакой і наймы” невядомых аўтараў. Пры атрыманні двух экземпляраў заказанай п’есы адзін працэнзураваны экземпляр трэба было вярнуць у інстытут для перасылкі іншым аматарам. Гэта выклікала рэпертуарны голад калектываў і значную трату часу.

Пад кіраўніцтвам БІГіК і ТБШ працаваў шэраг гурткоў у Браслаўскім павеце: м. Браслаў (вул. Пілсудскага), вёсках Барадзенічы, Цяцеркі, Семянішкі, Густаты. Пазней да іх далучыліся Іказнь, Шальціны, Зарачча, Шаўляны, Юравічы, Перабродддзе, Якушы, Казяны, Слабодка, Нова-Пагост і іншыя. Такую вялікую колькасць драматычных гурткоў, якія працавалі з беларускім рэпертуарам, можна растлумачыць плённай працай драматычнай студыі пры Дзяржаўных аднагадовых беларускіх настаўніцкіх курсах у Дзвінску (сучасная Латвія, Даўгаўпілс.— І.А.). Многія настаўнікі школ павета атрымалі першы вопыт сцэнічных пастановак і ўдзелу ў іх пад кіраўніцтвам слыннага беларускага дзеяча К.Езавітава. А ў 1929 годзе на тэрыторыі Браслаўскага павета Дзвінскай драмстудыяй ладзяцца Дні беларускай культуры. Як прыклад, прадстаўленні па п’есе “На Антокалі” Ф.Аляхновіча і выступленне хору ў в. Баруны, якія наведалі 150 чалавек, і спектакль “Птушка шчасця” Ф.Аляхновіча з прамовай К.Езавітава. Да таго ж многія выпускнікі курсаў працавалі настаўнікамі на тэрыторыі павета і стваралі драмгурткі, у якіх бралі ўдзел не толькі школьнікі, але і моладзь.

Больш скупыя звесткі аб беларускамоўных пастаноўках сустракаюцца ў іншых паветах рэгіёна. Напрыклад, дзейнасць гурткоў у в.Сталіца, м. Германавічы Дзісненскага павета, поўная адсутнасць такога роду арганізацый пэўны час у Шаркаўшчынскім павеце. Аднак імкненне моладзі да заняткаў сцэнічнай творчасцю вельмі вялікае, і доказам гэтаму служаць лісты з мястэчак і вёсак аб жаданні стварыць драмгурток. Перыядычныя выданні таго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часу ("Крыніца", "Шлях моладзі" і іншыя) не толькі друкуюць артыкулы аб аматарскіх тэатрах і тэатральнай справе на Віленшчыне, але і калі-нікалі аналізуюць аматарскія пастаноўкі. Грунтуючыся на дадзеных матэрыялах, можна гаварыць аб вялікай цікавасці да беларускамоўных пастановак на вёсцы і іх вялікім поспеху сярод гледачоў.

Прадстаўленні адбываліся па агульнавядомай схеме вечарын: драматычная пастаноўка, спевы, танцы, гульні, у якіх прымалі ўдзел як артысты, так і гледачы. Рэпертуар складаўся ў асноўным з добра вядомых камедый, невялікіх па змесце і нескладаных для пастаноўкі. Вялікай разнастайнасцю рэпертуар драмгурткоў не вылучаўся — з прычыны недахопу беларускамоўных драматычных твораў, наяўнасці цэнзуры, непадрыхтаванасці гледача, падыходу многіх кіраўнікоў да аматарскай самадзейнасці як сродку дзейснага адпачынку ад клопатаў штодзённага жыцця. Прывядзём пералік некаторых твораў, уключаных у рэпертуар аматарамі ў 2-й палове 1920 — пач. 30-х гадоў: "У кавалёвай хаце", "Суд" У.Галубка; "Пінская шляхта" В.Дуніна-Марцінкевіча; "Мікітаў лапаць" М.Чарота; "Модны шляхцюк" К.Каганца; "Сурдут і сярмяга" У.Гутоўскага; "Каліcь", "Чорт і баба", "Боты", "Птушка шчасця", "Заручыны Паўлінкі" Ф.Аляхновіча; "Збянтэжаны Саўка", "Пасланец", "Конскі партрэт" Л.Родзевіча і іншыя. Найбольшай папулярнасцю і любоўю гледачоў карысталіся творы Ф.Аляхновіча і Л.Родзевіча.

Спектаклі ў большасці сваёй ставіліся ў непрыстасаваных будынках — магазінах, вялікіх хатах, гаспадарчых пабудовах, дзе перад вечарынай ладзілі імправізаваную "сцэну" і "глядзельную залу". Пры афармленні выкарыстоўвалі рэквізіт, сабраны па хатах. Цікава апісана мастацкае афармленне вечарыны ў в.Шальціны Браслаўскага павета (1933 год). Пры пастаноўцы твораў "Чорт і баба" і "Боты" Ф.Аляхновіча на пляцоўцы пад адкрытым небам аматары выкарысталі нацыянальную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сімволіку: бел-чырвона-белы сцяг і "Пагоню" ў абрамленні саматканых дываноў. Дэкарацыя зачароўвала сваёй прыгажосцю, а народныя песні і гімн "Не пагаснуць зоркі ў небе" хвалявалі душу і сэрца гледача, стваралі незабыўны святочна-ўрачысты настрой.

Акрамя спектакляў у роднай вёсцы, гуртkоўцы ставілі іх і ў іншых населеных пунктах. Мэта многіх пастановак была дабрачыннай, а мізэрныя сродкі, атрыманыя драмгуртkоўцамі ад прадстаўленняў, у большай частцы выкарыстоўваліся для развіцця школ і атрымання беларускай літаратуры.

Згодна справаздачам і вынікам гадавых сходаў рады БІГіК можна прасачыць плённасць дзейнасці гурткоў Інстытута на драматычнай ніве. За 1931 год удзельнікамі тэатральных калектываў наладжана больш за 30 прадстаўленняў. У 1932—1933 гг. лічба павялічваецца да 100. А вось у 1935 годзе рэзка скарачаецца да 40. Спад быў выкліканы шэрагам прычын: цяжкае матэрыяльнае становішча гурткоў, рэпертуарны голад, рэзкі ўціск з боку польскіх улад, недахоп высокаадукаваных спецыялістаў і вопыту. Аднак галоўная прычына — "творчыя рэпрэсіі", якія значна актывізуюцца ў 1936 годзе. Шматлікія забароны на арганізацыю новых гурткоў, штрафы, арышты, рэвізіі, высылкі кіраўнікоў, забарона ўжо падрыхтаваных спектакляў, ліквідацыя гурткоў. У выніку паралізуецца вялікая сетка культурна-асветніцкіх беларускіх арганізацый, драмгурткоў, спыняюць сваю дзейнасць БІГіК і ТБШ. Існаванне калектываў, якія працавалі, грунтуючыся на народнай творчасці, заўсёды сустракала шмат перашкод не толькі з боку афіцыйных улад, але і носьбітаў паралельна існуючай польскай культуры. Шматлікія прадстаўнікі "шляхты", не раз крытыкаваныя беларускімі драматургамі за адрыў ад народных каранёў, зразумела, не прымалі пастановак вясковых "тэатралаў", называлі іх "мужыцкімі", вялі актыўную антыбеларускую прапаганду, ставячы і агітуючы гледачоў паглядзець сапраўднае "шляхетнае"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўленне. Простыя сяляне і інтэлігенцыя, са свайго боку, не прызнавалі "панскіх", "асадніцкіх" спектакляў, байкатавалі іх выступленні, ладзячы свае вечарыны.

Аднак сустракаюцца шматлікія факты, якія красамоўна сведчаць аб супрацоўніцтве дзвюх культур, калі "палякі" стваралі па творах беларускіх драматургаў спектаклі, а афіцыйныя кіраўнікі шматлікіх "колаў" і "стовыжыстваў" давалі дазвол на беларускамоўныя пастаноўкі, прычым грошы, сабраныя аматарамі, часам выкарыстоўваліся для набыцця беларускіх выданняў. Гэтая з'ява дастаткова часта назіраецца ў Дзісненскім, Пастаўскім, Браслаўскім паветах.

Не толькі кіраўнікі грамадскіх культурна-асветніцкіх арганізацый, але як праваслаўныя, так і каталіцкія рэлігійныя дзеячы клапоцяцца аб росце духоўнай культуры вясковай і местачковай моладзі. З гэтай мэтай не толькі ладзяцца аднаразовыя выступленні і паездкі са спектаклямі, але і ствараюцца мастацкія калектывы пры цэрквах, касцёлах, кляштарах.

Прыкладам можа быць дзейнасць аматарскага тэатра гімназіі імя Стэфана Баторыя ў м.Друя Браслаўскага павета. Створана гімназія пры кляштары беларускіх айцоў Марыянаў у 1924 годзе. Кляштар існаваў да 1939 года, пакуль манахі не былі выселены з Беларусі, а кіраўнік гімназіі і стваральнік тэатра айцец А.Цікота не рэпрэсіраваны. Сярод навучэнцаў гімназіі і ўдзельнікаў тэатра былі вядомы беларускі рэлігійны дзеяч, ксёндз А.Цікота; біскуп, заснавальнік бібліятэкі імя Ф.Скарыны ў Лондане Ч.Сіповіч; беларускі пісьменнік Я.Германовіч (Вінцук Адважны); польскі пісьменнік А.Голубеў і іншыя. Рэжысёры тэатра (А.Цікота, А.Голубеў, Г.Куковіч) удзялялі вялікую ўвагу не толькі рэлігійнаму, але і маральна-эстэтычнаму выхаванню ўдзельнікаў тэатра і гледачоў. У рэпертуар школьнага тэатра ўваходзілі наступныя творы: "Гасподскія шлюбы", "Дамы і гусары" А.Фрэдра; "Ночы лістападныя" С.Выспянскага; "Дзяды",

“Пан Тадэвуш” А.Міцкевіча; “Ноч на святога Яна”, “Яселка”, “Рацлавіцкія косы”, “Не пакінем зямлі”, “Веслава”, “Безыменныя волаты”, “Вялікія імправізацыі”, “Стану бялейшы, чым снег” і шэраг іншых. Большасць п’ес — польскамоўныя, але ўвогуле ў гімназіі беларуская мова не забаранялася. Тэатр меў добрую сцэну і стабільную грашовую падтрымку. Дэкарацыі да некаторых спектакляў выконвалі прафесійныя мастакі з Вільні. Добра была наладжана і гастрольная дзейнасць: два разы на дзень па нядзелях адбываліся прадстаўленні са спевамі і танцамі як у Друі, так і навакольных вёсках. Спектаклі карысталіся вялікім поспехам не толькі сярод вясковых жыхароў, але і ў Браславе.

У мясцінах, дзе не было ні беларускіх, ні польскіх гурткоў і арганізацый, больш актыўная моладзь ладзіць свае вечарыны, на якіх гучаць родныя песні, кружыць галаву “Лявоніха”. Не толькі моладзь, але і старэйшае насельніцтва збіралася разам, каб адсвяткаваць народнае свята, пагуляць у “Яшчура” ці “Жаніцьбу Цярэшкі”.

Клапатліва вывучаючы і аналізуючы нешматлікія звесткі аб дзейнасці аматарскіх тэатральных гурткоў Прыдзісненскага рэгіёна, усё больш пранікаешся павагай і любоўю да свайго народа, да яго культурнай спадчыны. І вельмі хочацца пажадаць, каб не зацягнула павуцінне забыцця тое, што збіралася і напрацоўвалася цэлымі пакаленнямі нашых папярэднікаў, каб наша духоўная спадчына, што праявіла сябе дзякуючы і тэатралам-аматарам, не загінула з ліквідацыяй культурна-асветных устаноў, а знайшла новыя, больш сучасныя шляхі самавыяўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ